Источник: "Культура" - 2018-04-21

# Пра любы край

**24 — 25 красавіка ў Любані пройдзе рэспубліканскі навукова-практычны семінар “Любанскі край на гісторыка-культурнай карце Беларусі”. Мерапрыемства прымеркавана да Года малой радзімы. Арганізатары — Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа, Любанскі райвыканкам.**

Яўген РАГІН

Толькі ў Любані такі семінар і праводзіць. Фальклорная сталіца краю, можна сказаць, дзе моцна знітаваліся любоў да слова, традыцыі, гісторыі. Так што ў Любані збяруцца навукоўцы (філолагі, фальклярысты, гісторыкі), педагогі, работнікі культуры, літаратары. Спектр пытанняў для абмеркавання таксама шырокі: ад мовазнаўства да археалагічных даследаванняў.

Падчас семінара падвядуць вынікі конкурсу творчых работ школьнікаў “Сцяжынкамі роднага краю”. Удзельнікі семінара наведаюць Музей промыслаў і рамёстваў, дзіцячую школу народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і ДШМ у Любані, Жораўскі дом народных традыцый, Смольгаўскую сярэднюю школу.

К

Яўген Рагін. Пра любы край